Все бы ничего бы, кабы число образованных белорусов белорусскую перспективу. А воспринятая населением, эта статистическая цифирь закрепляет у белорусов неадекватное самомнение и такое же неадекватное поведение. Пусть у нас плохо, зато, по авторитетному мнению чиновников ООН, в рыночной России и на вольной Украине еще хуже. Плохое на худшее менять не охота, и вот у нас в Минске, как в том Багдаде, – все спокойно.

Рейтинг ИРЧП для Беларуси в сравнении с другими государствами

Страна	Год	
	1993	1995
Венгрия	46	47
Словакия	41	42
Польша	56	52
Латвия	55	92
Россия	57	72
Беларусь	61	68
Эстония	68	77
Литва	81	79
Украина	80	102

ИЗ ПЕРВЫХ УСТ

АМНИСТИЯ или РАСЧЕТ

Верховный суд отменил приговор городского суда по делу бывшего премьер-министра страны. Дело Михаила Чигиря отправлено на доследование. Это решение устраняет последнее препятствие на пути выдвижения его кандидатуры на выборах президента, добавляя еще одну интригу в предвыборную кампанию. На вопросы корреспондента «Згоды» Александра Кавальского отвечает сам Михаил Чигирь.

– Михаил Николаевич, как Вы считаете, чем было продиктовано решение Верховного суда: искренним желанием восстановить попранную справедливость или все-таки внести некоторую сумятицу в оппозиционные ряды, добавив еще одного претендента на президентский пост?

– Я считаю, что Верховный суд изучил дело, вник в его суть и содержание и не нашел оснований для вынесения обвинительного приговора. Заявление БТ о том, что дело направлено на дополнительное расследование в связи с мягкостью приговора явно не соответствует действительности. Дело направлено на доследование в связи с отсутствием оснований для вынесения обвинительного приговора. Поэтому я считаю, что в данном случае Верховный суд поступил как суд. Можно было надеяться и вообще на оправдательный приговор, но на данном этапе из-за сложившейся ситуации такое решение суд вынести не мог, и потому отправил дело на дополнительное расследование.

Что значит доследование моего уголовного дела? Следственная группа в количестве 23 человек работает уже больше года и восьми месяцев. Если они за этот период не нашли достаточных оснований для того, чтобы меня в чем-либо обвинить, то они больше ничего и не найдут. Потому что то, в чем меня обвиняли, не соответствует действительности и не подтверждается материалами уголовного дела. Конечно, оправдательный приговор был бы лучше, но на данном этапе решением Верховного суда я доволен.

– То есть политическую подоплеку этого решения Вы отрицаете?

– Если бы у меня был рейтинг такой же, как у остальных, то можно было бы сказать, что власть хочет внести неразбериху в оппозиционные ряды. Но на сегодня у меня самый высокий рейтинг среди оппозиционных кандидатов, поэтому такое мнение, по-моему, не имеет под собой оснований.

– Вы уже консультировались или собираетесь консультироваться с различными политическими партиями по поводу своего выдвижения?

– Я, конечно же, консультировался, консультируюсь и буду продолжать консультации с партиями по вопросу, кого они поддержат на президентских выборах и на каких условиях. Если они согласны поддержать меня, то также надо договариваться, на каких условиях. Кроме того, если я увижу политика, пользующегося мощнейшей поддержкой, имеющего высокий рейтинг и шансы выше, чем у меня, я перейду в его команду. Для меня важнее всего – изменение политической ситуации в стране.

– Еще до решения Верховного суда ходили слухи, что, если приговор будет не в Вашу пользу, Вы перейдете в команду Владимира Гончарика. Насколько это соответствует действительности?

– Я еще не знал, в какую команду я бы перешел. Как один из возможных вариантов была и работа с Гончариком. Я встречался с Владимиром Ивановичем, спрашивал, как его мнение, мнение профсоюзов. Я не отходил от политической жизни, встречался с представителями партий, узнавал, на кого они делают ставку. Но также хочу подчеркнуть, что единолично решения я не принимаю. У меня есть своя команда, с которой я работал еще в 1999 году, а потом на парламентских выборах. Это люди, которым я доверяю, которые меня поддерживают, которые могут открыто поправлять, если я не прав. С ними я обсуждаю ситуацию и принимаю решение.

– Для выдвижения единого кандидата учитывается не только положительный рейтинг, но и отрицательный. Это должен быть политик, которого соперникам будет сложно дискредитировать перед избирателями. В этой связи Вы не думаете, что Вас будет легко дискредитировать? По БТ ежедневно Зимовский и Козиятко будут выплескивать с экранов тонны грязи в Ваш адрес, охмуряя избирателей: мол, проворовавшийся банкир или неудавшийся премьер.

– Это было бы верно, если бы дискредитация не началась в 1999 году, если бы тогда не началось уголовное преследование и если бы оно не завершилось тем фиаско для следствия, которое мы имеем сегодня. После того, как на меня на протяжении года и восьми месяцев вылито столько грязи – сначала заявляли, что я украл пять миллионов, потом десять, потом двадцать – выйти и опять говорить то же самое? Я думаю, будет обратная реакция. Встанет вопрос: ну как же проворовался, если суд не нашел оснований для приговора. Поэтому дискредитация будет проводиться и, возможно, незначительно повлияет на мой рейтинг. Но на здравомыслящих избирателей это влияние не окажет. Я уже грязи получил предостаточно, и сегодня оказывается, что чем больше грязи на тебя вылито, тем больше рейтинг.

– Сразу после решения городского суда, когда Вас приговорили к трем годам, прокуратура заявила, что не довольна мягкостью приговора и что ведется другое уголовное дело в отношении Вас, но по другим эпизодам. Что это за дело?

– По другим эпизодам следствие не прекращается. Но и там они ничего не могут накопать, чтобы передать дело в суд. А если передадут, то оно рассыплется еще быстрее, чем предыдущее. Сейчас меня проверяют по поводу уплаты подоходного налога с заработной платы за период работы в Москве. Проверяют уже полтора года, но за это время так и не подготовили материал. Тем более, что по закону (я и сам до начала следствия этого не знал) я налог вообще не должен был платить, потому что на территории Беларуси не жил. Я проживал в Москве. В законе до 1999 года было записано, что граждане Республики Беларусь, проживающие за пределами страны свыше 183 дней в году, подоходный налог в Беларуси платить не должны. Мне ничего не стоит доказать, что в 1998 году я прожил в Москве больше 183 дней. Следователи нашли квартиру в Москве, где я жил, знают, что я приезжал сюда, в Минск, раз или два в месяц на выходные. На налоги, которые я уплатил, можно было в 1998 году выплачивать зарплату премьеру и президенту. Они посчитали, что этого мало. Но сейчас я сделал заявление, чтобы мне вернули эти деньги обратно, потому что я этот налог платил незаконно.

P.S. На заседании Национального комитета Объединенной гражданской партии было проведено рейтинговое голосование по поводу единой кандидатуры от демократических сил на президентских выборах. Михаил Чигирь набрал 51 голос и занял первое место. Следом идут бывший министр обороны Павел Козловский, Семен Домаш и Анатолий Лебедько.

КОММЕНТАРИИ ЭКСПЕРТОВ

Сергей Альфер (Белорусский центр конституционализма и сравнительно-правовых исследований): Решение Верховного суда по делу Михаила Чигиря было однозначно политическим, и его целью было увеличить количество потенциальных кандидатов на должность президента от оппозиции. С другой стороны, Верховный суд не просто оправдал Михаила Чигиря, а отправил дело на дополнительное расследование. Этот шаг позволяет власти в любой момент повторить ситуацию 1999 года, заменив бывшему премьеру меру пресечения с подписки о невыезде на арест «в связи с открывшимися обстоятельствами дела». А как мы знаем, нельзя провести полноценную избирательную кампанию, находясь за решеткой. Тем не менее, я не считаю, что эти действия власти могут привести к расколу оппозиционных сил. Сейчас ведется активное согласование кандидатуры со всеми политическими субъектами и силами. В течение месяца-двух пройдет полное согласование и произойдет выдвижение единого кандидата.

Валерий Карбалевич (главный эксперт аналитического центра «Стратегия»): Трудно однозначно сказать, было ли решение Верховного суда политическим. Существуют разные версии: либо в сознании верховных судей право возобладало над политикой, либо, действительно, власть сделала ставку на раскол оппозиции. Кандидатура Чигиря вряд ли добавит перспектив консолидации оппозиции, скорее способна углубить раскол и неопределенность в оппозиционных рядах, добавить пищи для раздоров. Вполне вероятно, что, если демократические силы выдвинут в качестве своего кандидата Михаила Чигиря, соберут за него подписи, начнут раскрутку, власть снова его осудит, дав условный срок. Таким образом, ловушка захлопнется.

ТРЭЦЬЦЯЯ ЎЛАДА

КАЗЫРНЫЯ АРГУМЭНТЫ КС

Тацьцяна ПАПОВА

Напрацягу гэтага году Канстытуцыйны суд РБ вынес рашэньні па 27-мі справах. Па меркаваньні яго старшыні Рыгора Васілевіча, яго кантора магла б працаваць і з удвая-ўтрая большым плёнам.

Васілевіч вельмі прасіў прысутных на яго прэс-канфэрэнцыі журналістаў пагадзіцца з тым, што Беларусь займае не апошняе месца сярод краін СНД па разьвіцьці абароны правоў сваіх грамадзянаў. Казырным аргумэнтам начальніка судовае ўлады сталася ўвасобленасьць прынцыпаў, зафіксаваных у аанаўскай Дэклярацыі правоў чалавека, у цяперашняй рэдакцыі канстытуцыі. Васілевіч шчыра ўпэўнены, што гэты варыянт ёсьць вельмі дэмакратычным дакумэнтам. Адылі, ён усьведамляе важнасьць таго, каб сыстэма дзяржаўнае ўлады працавала на забесьпячэньне правоў ды свабодаў свайго грамадзтва.

Неяк няпэўна й нібы між іншым старшыня Канстытуцыйнага суду (КС) паведаміў аб адсутнасьці буйнамаштабных парушэньняў правоў і свабод чалавека ў рэспубліцы. *«Нават калі нейкія правы ці свабоды парушаюцца, дык гэта віна саміх грамадзян,»* – папярэдзіў контраргумэнты Васілевіч. Па яго меркаваньні, у межах закона людзі павінны змагацца больш актыўна. Ад імя ўсяго КС ён паабяцаў задавальняць скаргі й кантраляваць выкананьне сваіх пастаноў. Для гэтага ў сваіх рашэньнях канстытуцыйныя судзьдзі будуць пазначаць спасылкі на дакумэнты, якімі яны кіруюцца.

Рыгор Васілевіч стаўся чарговым удзячным чытачом усіх кодэксаў, якія паназацьверджвалі палатнікі першага скліканьня. *«Канстытуцыя, у якой прапісана вельмі шмат міжнародных палажэньняў, вымагае адпаведнай заканадаўчай базы».* Цяпер важна стварыць практыку карыстаньня гэтымі дакумэнтамі. У наступным годзе КС давядзецца аналізаваць выкарыстаньне новых кодэксаў на практыцы. Насамрэч, папярэдне гэтым мусілі заняцца прагназісты. Яны павінны былі падрыхтаваць справаздачы аб дробных і буйных памылках ды недарэчнасьцях.

Старшыні КС хацелася б, каб з пачаткам дзеяньня новых кодэксаў у судовай практыцы адбыліся якасныя зьмены. Але сумнеў у прафэсыйнасьці заканадаўства ахінуў нават яго розум. Для прыкладу, Васілевіч прапанаваў зьвярнуць увагу на Крымінальны кодэкс. У ім ёсьць запіс аб тым, што беларуская феміда трымаецца міжнародных стандартаў пры ўтрыманьні зьняволеных за кратамі. Рэальна, умовы ў турмах нечалавечыя, а з 1 студзеня 2001 году цесныя брудныя казематы не ператворацца ў камфортныя пакоі. Чарговая амністыя таксама не палепшыць сытуацыі.

Дзеці, гуляючы ў крамніка, разьлічваюцца за яблыкі й цукеркі рэзанай паперай. Яны ведаюць, што ў сапраўднай краме за такія грошы ім не дадуць ласункаў. Беларускія законы такія ж, як гэтыя папяровыя абрэзкі. Дэпутаты ствараюць іх, Лукашэнка падпісвае, але на рэчаіснасьць гэта ніяк не ўплывае. Яны існуюць нібы панарошку, толькі для таго, каб, калі трэба, аспрэчыць рэчаіснасьць, маўляў, так у законе напісана.

Старшыня КС, пэўне, чуючы размовы аб перадачы часткі прэзыдэнцкіх паўнамоцтваў Нацсходу, захацеў большае ўлады. Проста прасіць дадатковых функцый ён пакуль баіцца, але аб магчымасьці пашырэньня поля дзейнасьці сваёй канторы па законе ўжо заяўляе. ■

© PDF: Kamunikat.org 2013 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

© PDF: Kamunikat.org 2013 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

ПОГЛЯД

ПАЖЫРАЛЬНІКІ РЭКЛЯМЫ

Глеб РУБАНАЎ

Ноч пажыральнікаў рэклямы другі год запар праходзіць у Менску. Выхаваная на савецкіх культурных традыцыях прэса няўмела расхвальвае «*прагрэсыўную*» зьяву. Але гэты артыкул мусіць дадаць лыжку воцату ў цыстэрну саладзейшага сіропу, прычэпленую да калекцыі Ж. М. Бурсіко.

Праблема грамадзтва спажываньня паўстала перад заходнімі краінамі напачатку 60-х. Спажываньне стала культам у сыстэме эканамічных арыентыраў. Грамадзтва, згвалтаванае сусьветнай вайной, прагнула найхутчэйшага росквіту. Але, як вядома, запраграмаваць чалавечае шчасьце – справа цяжкая. Звычайна ў такіх выпадках палітыкі вырашаюць праблему проста, абвяшчаючы мерай чалавечага шчасьця нейкі адвольны, зручны для іх крытэр. Такім крытэрам стала спажываньне.

Больш аўтамабіляў, шкарпэтак, кніг, кінафільмаў... У рэшце рэшт грамадзтва прыйшло да заканамернага парадоксу. Аказалася, што, каб далей будаваць прагрэс, чалавецтву ўвогуле не патрэбна думаць. Любы сумнеў – гэта верагоднасьць адмовы ад акту спажываньня, а значыць – аддаленьне ўсеагульнага шчасьця й росквіту.

Пабудаваная на канцэпцыі ўсеагульнага спажываньня сыстэма апынулася здольнай да самаарганізацыі, самаразьвіцьця й самаабароны. Падмуркам новага грамадзтва стала сьвядомасьць мільярдаў абывацеляў, а самым надзейным сродкам уплыву на яе – рэкляма. Чым больш бунтавалі супраць татальных стандартаў разьвіцьця маладыя панкі й прагрэсыўныя мастакі, амэрыканскія анархісты ці парыскія студэнты, тым больш навязьліва рэкляма абараняла лад утульнага існаваньня ў спажывецкім грамадзтве.

Рэкляма – гэта сёньняшні варыянт гебельсаўскай прапаганды. Яна ўплывае на падсьвядомасьць, прывучаючы ня думаць, а спажываць. Замест мазгавой дзейнасьці мы разважаем рэклямнымі штампамі. Любы сьветапогляд паступова ператвараецца ў простую суму любімых стандартных выказваньняў і поглядаў. Слоганы як цаглінкі ўваходзяць у падмурак жыцьцёвага погляду і ўспрыманьня.

Цікава з пункту гледжаньня рэклямнага ўплыву выглядала ўспрыманьне ў грамадзтве вайны на Балканах і бамбёжак НАТО. Любы погляд на праблему ўяўляў сабою набор разрэклямаваных па TV догмаў, якія іх прыхільнікі паўтаралі як набор апошніх аксыяматычных аргумэнтаў. Нейкая трэцяя пазыцыя сустракалася вельмі рэдка і выклікала шчырае зьдзіўленьне ды непаразуменьне. Абодвум бакам было ўтульна існаваць у рамках стандартаў: «За Мілошавіча, супраць НАТО» ці наадварот. Аб сутнасьці праблемы ніхто практычна не задумваўся. У рэшце рэшт перакананая пазыцыя па гэтым пытаньні вызначалася назвай любімага тэлеканалу.

Чым жа ў такім кантэксьце выглядае *«прагрэсыўная культурная зьява»* ад Бурсіко? Ні чым іншым як смакаваньнем мэтадаў абалваньваньня масаў. Фактычна, прымаючы ўдзел у «ночы пажыральнікаў», мы ідзем на выставу прафэсыйнага, прыгожага й жорсткага агітпропу. Мэта яго – выхаваньне новага чалавека, цалкам падкантрольнага тэлевізыйна-рэклямным стандартам.

Акцэнт на слове «пажыральнік» яскрава адлюстроўвае ідэальнага спажыўца. Ён бесперапынна параідальна спажывае, бо ў гэтым сэнс ягонага існаваньня. «Ноч пажыральнікаў рэклямы» – кульмінацыя спажываньня і ягоны экстаз. Тут ужо спажываецца не толькі прадукт (ён ня мае значэньня), але й сама абалонка (мэтады агітацыі ды прапаганды).

Любая рэкляма, як любы ўплыў на падсьвядомасьць, – гэта яшчэ й наркотык, без рэгулярнага ўжываньня якога спажывец адчувае сябе вельмі няўтульна. Прагляд рэклямы ўсю ноч да адурэньня – гэта форма какаінавай оргіі для сёньняшняй эліты.

Не маючая ўласнага творчага крэатыву, раструшчаная поступам новай эпохі, багема падкрэсьлівае сваю элітарнасьць шляхам мастацкіх оргіяў і паказальнага творчага самазьнішчэньня. Гэта завецца дэкадэнсам.

Чаму ж для нас так прыцягальна вельмі сумная па сваім сэньсе акцыя Ж. М. Бурсіко? Акцыю рэклямуюць як прарыў сусьветнай культуры, але гэта руіны той культуры, якую пахаваў пад сабой навукова-тэхнічны прагрэс. Сапраўдная заслуга Жана-Мары Бурсіко ў іншым. Прагрэсыўная культура мусіць дапамагаць чалавеку зьмяняць навакольны сьвет, спраўляцца з праблемамі й хваробамі грамадзтва. Зьяўленьне дэкадэнцкіх фэномэнаў сьведчыць аб гэтых праблемах, а значыць, дазваляе іх перамагчы. Менавіта гэтую місыю (сьвядома ці несьвядома) ўзяў на сабе францускі дзівак-калекцыянэр Жан-Мары Бурсіко. Пабачыўшы свае праблемы, грамадзтва мусіць іх пераадолець. Калі мы ня скінем з сабе хамут спажывецкага сьветапогляду, то патонем у жорсткіх абдымках новага таталітарнага грамадзтва. Трэцяга шляху няма. ■

СПАЖЫВЕЦ

Краіна адбросаў

Таццяна ПАПОВА

Разьвітыя дзяржавы, здольныя забясьпечыць дабрабыт сваіх грамадзянаў, пакідаюць самыя лепшыя дасягненьні сваёй вытворчасьці на ўнутраных рынках. Яны клапоцяцца, каб менавіта іх насельніцтва адчувала сябе максымальна камфортна, спажывала толькі бясьпечныя й карысныя для здароўя прадукты, магло мець усё, што толькі душачка пажадае.

Беларуская дзяржава свае лепшыя тавары выкарыстоўвае для заваёвы зьнешніх рынкаў. Валюта на разьвіцьцё ўпарта-непад'ёмнае сельскае гаспадаркі мае большую значнасьць, чым задаволенасьць грамадзян. Экспартна-імпартная арыентаванасьць нашай эканомікі ўсяляк падкрэсьліваецца паўсюль, дзе гаворка ідзе аб фінансах.

У несамавітых кішэнях беларускіх грамадзян часам не знаходзіцца грошай, каб заплаціць за якасныя тавары хаця б па сабекошце. Вытворчасьць жа танных відаў прадукцыі, якая павінна задавальняць сьціплыя спажывецкія апэтыты, робіцца стратнай для прадпрыемстваў. Тым ня меньш, учыняючы апошні разгон свайму ўраду, Лукашэнка запатрабаваў ад яго, каб такія тавары былі ў крамах. Маўляў, хутка Новы год (а там і выбары).

Якасьць нават люксавае беларускае прадукцыі часта ставіцца пад сумнеў разбэшчанымі замежнікамі. Перад тым, як заключаць кантракты аб пастаўках з гомельскімі вытворцамі цукерак, у ЗША скрупулёзна вывучалі ўласьцівасьці трыццаці відаў карамелек ды шакалядак. Беларускім пакупнікам заміж ласункаў ад «Спартака» навязваюць «Чупа-чупсы» ды «M&Ms»-ы. Прычым на тое, што гэтыя дзіцячыя радасьці былі зробленыя на фірменных фабрыках, спадзявацца не даводзіцца.

Наагул, да спажывецкага згуртаваньня, што налічвае каля 10 мільёнаў кашалькоў, замежныя вытворцы ставяцца небезуважна. Беларускі рынак з удзячнасьцю прымае танныя тавары й добра разрэклямаваныя гандлёвыя маркі.

Рэкляма добра чапляе неперабарлівых беларускіх пакупнікоў. Нагледзеўшыся на цудоўны «Е», яны аддаюць грошы за пральны парашок менавіта з гэтай літарай на пакунку. Гаспадыня й не думае, што сродак, паказаны ў рэкляме, нават гіпатэтычна ня можа апынуцца ў скрынцы. Натуральны *Е* ангельскае вытворчасьці каштуе ў некалькі разоў больш за расфасаваны на сховішчы пад Менскам кустарны прадукт.

Каб састрыгчы большыя грошы рэалізоўваючы танную, часта самапальную прадукцыю, пакункі для яе замаўляюць у дызайнэрскіх агенцыях. Майстры-мастакі, ва ўмовах адсутнасьці кліентуры, не адмаўляюцца ад працы. Таму, колькі ні шукай, ня знойдзеш у Беларусі натуральнае раставаральнае кавы, якую п'юць вясёлыя людзі ў перапынках паміж тэлепраграмамі, не натрапіш на сапраўдныя касмэтычныя рэчывы, ад якіх скура мадэлек робіцца аксамітнай.

Няма ў Беларусі й сапраўдных замежных вырабаў з тытуню. Між тым, яны атрымліваюць найбольшую рэклямную раскрутку ў нашай краіне. Бясконцыя акцыі з абменам пяцёх крышачак ад пачкаў цыгарэт пэўнае маркі на новы пачак, несупыннае гойсаньне падлеткаў у формавай вопратцы, што раздаюць запрашэньні на дыскатэкі для аматараў тае ці іншае маркі, кідкія й паўсюдныя рэклямныя шыхты – вось далёка няпоўны сьпіс навязьлівых прапаноў зацягнуцца.

Пэўне, імпартныя цыгарэты больш прыемныя, чым айчынныя, але няма ніякае гарантыі, што ў замежных пачках месьціцца прадукцыя, якая адпавядае міжнародным стандартам якасьці.

Мэта кожнага небагатага спажыўца – патраціць як мага меней грошай, набыўшы як мага больш тавараў. Таму нават непрыхаваная яркай абгорткай шкодная прадукцыя карыстаецца ў Беларусі сталым попытам. Яшчэ нядаўна сотні дасьледчыкаў пераканаўча тлумачылі ўсяму чалавецтву, як уплывае ўжываньне курыных ножак на здароўе. Увесь сьвет прыслухаўся да парадаў навукоўцаў і адмовіўся ад танных акарачкоў глыбокае замарозкі. У нашай краіне ножкі дагэтуль ідуць за мілую душу.

Неабходнасьць эканоміць на ўсім змушае беларусаў набываць невядома з чаго зробленыя вермішэлькі «Роллтон». Попыт на іх значна большы, чым на вельмі высокаякасныя спагеці беларускае вытворчасьці. Апошнія каштуюць на нейкія 50 зайчыкаў-домікаў больш, чым экспрэс-макарошкі, бо ўсе кампанэнты ў іх натуральныя і толькі вышэйшага гатунку. Але навязьлівая прапаганда *fast food*, прыхільнасьць да якога зусім не ўласьцівая беларусам, вызначае выбар спажыўцоў.

Верыць, хаця й вельмі асьцярожна, можна хіба толькі рэкляме расейскае прадукцыі. Тамтэйшыя вытворцы працуюць больш ці менш сумленна. Сыравіна для іх фабрык ды заводаў часта мае беларускае паходжаньне. Нашае чыноўніцтва не бяз гонару прадстаўляе справаздачы аб тэмпах разьвіцьця прыярытэтнае галіны беларускае эканомікі – экспарту. Менш гучна міністры распавядаюць аб тым, што пасьля зробленае ў Смаленску зь беларускага малака масла трапляе на беларускія ж бутэрброды.

Задушаныя падаткамі беларускія прадпрыемствы змушаныя павышаць кошты. Яны ня здольныя скласьці сур'ёзную канкурэнцыю расейскім вытворцам, што маюць шматлікія падаткавыя палёгкі й прэфэрэнцыі.

Па прагнозах некаторых эканамістаў, да ліпеня наступнага году паміж Беларусcю ды Расеяй могуць скласьціся такія ж адносіны, як паміж лацінаамэрыканскімі краінамі й ЗША. Краіна пад зорна-паласатым сьцягам забясьпечвае прадукцыяй больш як 40 адсоткаў спажывецкага рынку ў Лацінскай Амэрыцы. Таму апошняя так моцна залежыць ад Злучаных Штатаў. Расейская экспансыя штодня прагрэсуе, таму канчатковая пакупка Беларусі братняю Русcю непазьбежна набліжаецца. ■

СПАДЧЫНА

Галоўны музей краіны

Таццяна АНТОНАВА-МЕЛЬЯНОВІЧ

Ці не даводзілася вам, мінчукі, перажываць горкае пачуццё крыўды і роспачы, калі вы сутыкаліся з неабходнасцю паказаць замежнаму госцю родны горад? Аказвалася, што пахваліцца асабліва няма чым.

Хіба што паблукаць па Траецкім прадмесці, падняцца на Верхні горад, дзе яшчэ захаваліся такія-сякія сляды мінулых стагоддзяў, прайсціся ўздоўж Свіслачы. Наведаць жа Нацыянальны музей гісторыі і культуры не прыходзіла ў галаву, бо размешчаны ён удалечыні ад галоўных турыстычных маршрутаў горада, а ўспаміны аб ранейшых экскурсіях туды пакінулі ў душы расчараванне.

Будынак

Нацыянальны музей Беларусі на сённяшні дзень знаходзіцца хіба што не ў самых горшых умовах сярод музейных устаноў сталіцы. Колішні дырэктар доктар гістарычных навук Захар Шыбека неаднойчы адзначаў, што размяшчаецца музей у непрыстасаваным для гэтых мэтаў будынку, узведзеным у 1902 годзе для Мінскага аддзялення Расійскага дзяржаўнага банка. Да таго ж, разам з ім у адзін будынак заціснуты яшчэ і музей прыроды і экалогіі. Знаны вучоны Захар Шыбека пайшоў з пасады дырэктара, бо сутыкнуўся з непераадольнымі цяжкасцямі па змяненні становішча і іміджу музея краіны.

Калісьці спецыяльна для Нацыянальнага музея гісторыі і культуры быў узведзены будынак. Але ў ім з 1967 года размясціўся музей вайны. Такое рашэнне ў свой час прыняў Пётр Машэраў. Так са свядомасці грамадзян паступова выцяснялася старажытная гісторыя краіны. А мілітарызаваная ідэалогія і дасюль працягвае дзейнічаць.

Пытанне аб будынку для Нацыянальнага музея неаднойчы ўздымалася перад беларускімі ўладамі. У пачатку 90-х гадоў Рада міністраў выдала пастанову, згодна з якой музею перадаваліся дамы 2, 4, 8, 10 на плошчы Свабоды. Але Міністэрства культуры зарубіла той праект. Безвыніковымі аказаліся і намаганні кіраўніцтва музея прапісацца ў будынку на плошчы Свабоды, 23 (былым Базыльянскім манастыры). Таму галоўны музей краіны дагэтуль цясніцца на старым месцы.

Фонды і экспазіцыі

Цяпер у Нацыянальным музеі гісторыі і культуры новы дырэктар. Хацько Пётр Сяргеевіч – вопытны музейшчык, 20 гадоў працаваў намеснікам дырэктара Нацыянальнага мастацкага музея. У спадчыну ад папярэднікаў яму дастаўся шыкоўны стол сям'і Радзівілаў, за якім ён вырашае штодзённыя справы. Падобнай мэблі, на жаль, не ўбачыш у музейных экспазіцыях – плошчы не дазваляюць.

У першыя дні знаходжання на новай пасадзе Хацько адправіўся аглядаць музейныя фонды, што захоўваюцца ў падвальных памяшканнях музея Вялікай айчыннай вайны. Па яго словах, умовы захоўвання экспанатаў там не адпавядаюць неабходным стандартам. З-за вільгаці і нізкай тэмпературы акзаліся папсаванымі каштоўныя рэчы.

«*Я ніколі не ўяўляў, якое багацце мае наш Нацыянальны музей,* – кажа дырэктар. – *У запасніках ёсць цудоўныя калекцыі гадзіннікаў, музычных інструментаў, фотаапаратаў, старажытных скарбаў, знойдзеных у розныя часы на тэрыторыі Беларусі, мастацкіх твораў... Іх ніхто не бачыў. У найбольш жахлівым становішчы там былі старадрукі. Мы проста вымушаны былі іх ратаваць*».

Энтузіязму і самаадданасці музейных работнікаў трэба аддаць належнае. Атрымліваючы мізерныя зарплаты, пазбаўленыя магчымасці выязджаць у навуковыя экспедыцыі і сустракацца з замежнымі калегамі, яны робяць усё магчымае і немагчымае, каб захаваць хоць рэшткі той багатай нацыянальнай спадчыны, што створана беларускім народам і захавалася да нашых дзён, зрабіць яе даступнай для карыстанняначыць.

У снежні гэтага года павінна адбыцца паседжанне калегіі Мінкультуры, дзе будзе абмяркоўвацца канцэпцыя новай экспазіцыі Нацыянальнага музея гісторыі і культуры.

«*Хацелася б у гэты раз абысціся без ідэалогіі,* – кажа Хацько. – *Чаму гэтак не адпавядае часу наш музей сёння? Чаму не выконвае ўскладзеную на яго місію? Ды таму, што не адлюстроўвае ва ўсім аб'ёме той складаны гістарычны перыяд, перажыты краінай за апошняе стагоддзе, не дае дакладнага ўяўлення пра мінулыя стагоддзі... Перад намі стаіць задача: як паказаць рэвалюцыйны рух, падзеі грамадзянскай вайны? Як прадставіць Другую сусветную вайну, калі ў нас ёсць музей Вялікай айчыннай? А рэпрэсіі, барацьбу з іншадумствам?*»

Новыя ідэі, безумоўна, вельмі неабходныя для функцыянавання Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі. І ёсць людзі ў краіне, якія здольныя генерыраваць такія ідэі, але ці далучаны яны да рабочай групы, што працуе над канцэпцыяй, ці можа ўплываць грамадскасць на прыняцце дзяржаўных рашэнняў? Напрошваецца і яшчэ адно пытанне: а ці здольныя новыя ідэі, калі нават яны і з'явяцца, ўвасобіцца ў дзейнасці адной асобна ўзятай дзяржаўнай установы культуры, калі сама дзяржава жыве ў палоне старых догмаў і састарэлых ідэалагічных канструкцый? Усе гэтыя пытанні пакуль не маюць адказаў. ■

© PDF: Kamunikat.org 2013 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

© PDF: Kamunikat.org 2013 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

ПОЧТИ АРХИВ

2000 – год подготовки к президентским выборам

Игорь ВОЛЯНИК, Александр КАВАЛЬСКИЙ

Тихо сам с собой... Сорвав переговоры с оппозицией в формате, предложенном ОБСЕ, Лукашенко инициировал так называемый широкий общественно-политический диалог со всеми общественными организациями и политическими партиями. Получалось, что, например, какое-нибудь общество защиты животных обсуждало поправки в избирательный кодекс, то есть занималось антиуставной деятельностью. А в это время Минюст вместо того, чтобы закрывать такие общественные организации, выносил предупреждения ОГП и другим демократическим организациям по принципу «почему в шапке, почему без шапки» (то на бланке эмблема слишком близко к электронному адресу, то конь на эмблеме не тот).

Объединенная оппозиция отказалась участвовать в этом цирке, сформулировав четыре требования, поддержанные ОБСЕ, выполнение которых способствовало бы выходу страны из затянувшегося конституционного кризиса. Требования касались демократизации выборного законодательства, установления в обществе климата доверия вместо репрессий оппонентов режима, обеспечение доступа оппозиции к СМИ и наделение реальными, а не ритуальными полномочиями Палаты представителей.

СМИ. Увлекшись достижениями современной генетики, белорусские власти решили тоже что-нибудь клонировать. В преддверии палатных и президентских выборов объектом клонирования было избрано БТ – власть объявила о скором открытии еще одного телевизионного канала. Существующий канал стали именовать Первым национальным (что выглядело несколько странно при отсутствии второго) и заменили его руководство. Председателем стал Виктор Чикин, заместителем – Александр Зимовский. Личности назначенцев подчеркивали главную политическую задачу белорусского телевидения – промывание мозгов избирателей.

Отношение к *«нячэсным»* журналистам очередной раз было продемонстрировано 25 марта во время традиционного марша в годовщину провозглашения независимости БНР. Практически всех корреспондентов зарубежных и отечественных СМИ люди в масках задерживали и свозили в часть внутренних войск на улице Маяковского, где, переписав и продержав несколько часов, отпускали.

Олимпиада. Летней Олимпиады-2000 в Сиднее спортивные чиновники ждали с тревогой: еще очень свежи были воспоминания об отставках после провала зимних игр в Нагано. Впервые накануне Олимпийских игр по телевидению белорусы смогли увидеть претендентов на награды в специальных роликах под названием «Наши олимпийцы». Вообще-то олимпийцами в Греции было принято называть богов, прописанных на горе Олимп, а победителей олимпийских игр – олимпиониками, но эта неточность несущественна. Главное – белорусы с интересом следили за успехами наших спортсменов в Австралии. И они не подвели, привезли домой 17 медалей (на две больше, чем из Атланты). Очень успешно выступили стрелки. Остряки даже пошутили по этому поводу: *«Если у нас в стране так много хороших стрелков, то почему мы уже четыре года живем при диктатуре?»*

Бойкот-2000. Индикатором единства оппозиции стал вопрос об отношении к прошедшим в октябре выборам в Палату представителей. Власть так и не выполнила ни одного из четырех условий, выдвинутых демократами и ОБСЕ. В конце лета в избирательный кодекс были внесены косметические поправки, выгодные прежде всего президенту. По признанию международных структур, белорусское выборное законодательство по-прежнему нельзя назвать демократичным. В этих условиях Конгресс демократических сил принял решение не участвовать в избирательном фарсе, чтобы не допустить международного признания Палаты представителей, и начал кампанию бойкота.

Несмотря на решение Конгресса, часть оппозиции все-таки пыталась участвовать в выборах, баллотируясь в палатных депутатов. Никто не удивился, когда о своем участии заявили коммунисты Калякина и псевдолиберал-демократы Гайдукевича, но так же поступила одна из старейших демократических организаций, член Координационной рады демсил, Белорусская социал-демократическая партия «Народная Грамада». Решение лидера партии Миколы Статкевича баллотироваться в палатку привело к организации внутрипартийной оппозиции – так называемой группы (фракции) Алексея Короля.

ТЕАТР

Абсурд, еще абсурд!

Татьяна ПОЛЯКОВА

«Театр – это и есть мир, – говорил Эжен Ионеско, *– мир со своим персонажами. А персонажами могут быть буря, ветер, незримые тайные силы, предметы, отсутствие персонажей, молчание».*

Все это является материалом, из которого строится мир театра парадокса, призванного *«показывать мир и жизнь в их реальной, а не приглаженной, не подсахаренной парадоксальности, вернее трагичности, и тем давать пищу уму, учить человека свободе выбора. Ибо человек не понимает и собственной жизни, и самого себя».*

Парадоксальная комедия Эжена Ионеско «Бред вдвоем» поставлена в Белорусском государственном молодежном театре Виталием Котовицким.

Мы видим на сцене некое подобие детской игровой комнаты. Светлые ширмы с изогнутыми краями ограждают ее от большого мира. Вся сцена подсвечена розовым. В центре – стремянка веселенького салатового цвета для спортивных упражнений. Есть и другие игрушки: пуфики, подушечки, проигрыватель, аккордеон, зеркало, посуда... А играют здесь двое великовозрастных детей: Он (Виктор Мочан, Сергей Новицкий) и Она (Анна Лаухина, Эвелина Сакуро) – супруги с 17-летним стажем.

У каждого из партнеров свои игрушки. Он распевает под аккордеон «Смейся, паяц...» и включает проигрыватель, из которого льется та же мелодия Леонкавалло. Она в основном играет с зеркалом: прихорашивается, переодевается. Она красивая женщина и каждую минуту жаждет в этом убедиться.

Есть у супругов общие игры. Игра первая – нескончаемый спор на тему: черепаха и улитка одно и то же или нет? В ход идет масса аргументов: черепаха имеет панцирь, улитка – домик, но у черепахи нет рожек и т.д. Это игра-замещение, а спор – сублимация, маскирующая застарелые взаимные претензии. *«Ты обольститель,* – говорит Она, – *увел меня из семьи, а потому я 17 лет без дома, без денег и без детей». «Мне сразу надо было понять,* – отвечает Он, – *что мы никогда не поймем друг друга».*

Так ругаются двое героев, *«изнывая от мелких своих катастроф»*. А когда страсти накаляются до предела, Он и Она начинают колошматить друг друга диванными подушечками. Что вызывает множество ассоциаций: от «Крейцеровой сонаты» до сказки, где *«старуха, дверь закрой!»*.



Где же парадоксальность? Нелепый спор мужчины и женщины происходит на фоне огромного мира, который слышит, впитывает несущийся от них сгусток агрессии и разражается огромным агрессивным взрывом в ответ. Он и Она ругаются в комнате, а на улице идет война. И когда супруги начинают нелепую драку, в ответ раздается уличный взрыв и пулеметные очереди.

На улице играют такие же великовозрастные дети, не понимающие ни себя, ни мира, ни Бога. У них столь же огромный запас агрессии в душе. Только игрушки пострашнее. Сначала в квартиру залетает граната. Под конец на авансцене оказывается бомба. Она тоже подсвечена розовым и напоминает большую красную конфету с бантом.

Супруги пытаются уйти из комнаты, но уйти им не дано. Как улитка и черепаха, они заползают в свои панцири и ждут... В финале ширма на заднике, символизирующая стены, раскалывается пополам. Большой агрессивный мир ворвался в маленький злобный мирок. *«Мне кажется, в человеке есть глубокая тенденция к разрушению и самоуничтожению...»* – говорил Ионеско.

Эта постановка – своеобразный опыт освоения непривычной нам эстетики. А поскольку зал практически полон (спектакль с интересом смотрят даже подростки), стало быть, опыт удался. И можно прогнозировать, что освоение новых художественных пространств на белорусской сцене будет продолжаться. ■

МУЗЫКА

Фэст гітарыстаў

Глеб РУБАНАЎ

Фэст «Грыфаманія», які другі год запар праводзіць фірма «Ковчег», адразу заваяваў аўтарытэт сярод прафэсыйных беларускіх гітарыстаў. І пры розным стаўленьні да дробязяў наўрад ці хто паспрачаецца з галоўным: «Грыфаманію» можна за нешта крытыкаваць. Але пры ўсіх недахопах яе параўноўваць няма з чым.

Так ужо вядзецца ў нашай краіне, што вельмі цяжка рабіць нейкія грунтоўныя праекты, зьвязаныя з рок-н-ролам. І справа тут не ў дамарошчанасьці ці непрафэсыйнасьці большасьці музыкаў, а ў татальнай абыякавасьці беларусаў да ўласных творцаў. Таму тыя, хто б'ецца лбом у мур, дзесяткі гадоў займаючыся ці то музыкай, ці то падтрымкай айчыннага рок-н-ролу, заслугоўваюць асобнага добрага слова. Бяз іх у нашым рок-н-рольным балоце ўвогуле не было б жыцьця.

Некалі Менск лічыўся адной з гітарных сталіц СССР. Тыя, каго 6-7 сьнежня сабрала ў ПК МТЗ «Грыфаманія-2000», у большасьці сваёй паспрыялі гэтаму ў розныя часы альбо яшчэ паспрыяюць у будучыні. Фактычна, за два сьнежаньскіх дні на фэстывальнай пляцоўцы выступіла ўся эліта беларускай гітары. Стылёвыя накірункі былі самымі рознымі.

Як заўжды прафэсыйна адыгралі гітарысты Сяргей Трухановіч і Андрэй Казлоўскі. Пэўным дысанансам на такім рытм-энд-блюзавым фоне выглядаў выступ вядомага канцэптуаліста Андрэя Іванова з «Зарціпо». Уласна кажучы, дысанансу ён і дамагаўся, бо, граючы ў стылі *noise* (шум), цяжка дасягнуць чаго-небудзь іншага. Яшчэ адным канцэптуалістам на фэсьце быў Лявон Нарушэвіч, лідар знакамітага «Князя Мышкіна». Дарэчы, гэты цікавы беларускі гурт мусіць хутка зьявіцца на НТВ у праграме Дыброва «Антрапалёгія». Ігар Волкаў («Сталіца», ех-«Гай») выступаў як прадстаўнік фольк-рокавай плыні. Нечакана для многіх ён паказаў сабе і як мультыінструмэнталіст, ужываючы апрэч свайго асноўнага інструмэнту – гітары – яшчэ й гармонік з блок-флейтай.

Што тычыць *«гітарыст-сюрпрызаў»*, абвешчаных у афішах, то гэтую нішу на фэсьце заняла школа Ўладзіміра Ўгольніка – найвядомейшага зь беларускіх гітарыстаў. Выступленьне Піта Паўлава (NRM, KRIWI) зьдзівіла многіх. Ад гітарыста, зразумела ж, чакалі цяжкога року й фірмовых ашаламляльных гітарных запілаў. Але, відаць па ўсім, сказалася падрыхтоўка да канцэрту «Крыві». Сэкс-сымбаль беларускага року выйшаў у суправаджэньні трыо бандурыстаў і пачаў сьпяваць пад акустычную гітару стылізаваныя пад фольк беларускія баляды.

Несправядлівым было б не ўзгадаць і пра яшчэ двух гітарыстаў. Першы зь іх – Лявон Вярэніч – з ужо заслужаных. Ягоны пранікнёны гітарны блюз заля слухала затаіўшы дыханьне. Ён нагадаў тым, хто пра гэта забыўся, што блюз – гэта не проста музыка. У блюзе ёсьць велізарная сіла, але валодаюць ёю толькі сапраўдныя майстры. Другі – малады Жэня Алейнік – з гуртом GAZYS выдаваў задорны й драйвовы рок, дэманструючы запал і энергію разам з прафэсыйным падыходам.

Фэст адбыўся. І ягоны кіраўнік Юрый Рашэтнікаў спадзяецца, што гэта не канец. «Грыфаманія» будзе жыць, пакуль у Беларусі будуць добрыя гітарысты й іхныя ўдзячныя слухачы. ■

19 СЬНЕЖНЯ КЗ «МІНСК»
эліта беларускага рок-н-ролу
(музыканты КРЫВІ, НРМ, Аляксандар Памідораў ды інш.)
у супольным праекце
Я НАРАДЗІЎСЯ ТУТ

«БЕЛАРУСКАЯ МАЛАДЗЁЖНАЯ» цэніць трапнае слова. Нашу газету на 50% ствараюць чытачы, ў нас знойдзецца месца Вашаму меркаванню.
«БЕЛАРУСКАЯ МАЛАДЗЁЖНАЯ» — «Армейская курылка», «Біржа працы», «Клуб людзей», «Права на слова» і «Незабытая вёска».
«БЕЛАРУСКАЯ МАЛАДЗЁЖНАЯ» — цікавая музычная старонка. Ад рок-н-ролу да хардкору. Інтэрв'ю, рэпартажы з канцэртаў, рэцэнзіі, аб'явы.
«БЕЛАРУСКАЯ МАЛАДЗЁЖНАЯ» — неблагая газета!
Мы працуем на будучыню — далучайся!
Талакой, як кажуць, і бацьку лягчэй біць!
ПАДПІСНЫ ІНДЭКС 63309

© PDF: Kamunikat.org 2013 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

© PDF: Kamunikat.org 2013
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

ПОНЕДЕЛЬНИК, 18 ДЕКАБРЯ

13.00, 15.00 Новости.
13.15 Телесериал «Капитан Немо».
14.35 Уроки Н.Новожиловой.
15.15 Музыкальная сказка «Мама».
16.40 Теленавигатор.
17.00 «Все мои дети». Сериал.
18.00 Новости.
18.15 Политические диалоги.
18.45 Зона Икс.
19.00 Худ.фильм режиссера Б.Бирсфорда «Шофер мисс Дейзи».
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.30 Событие.
21.50 «Площадь Беркли». Сериал.
22.40 Стадион.
23.05 Планета «АРТ».
23.35 Новости.
23.50 «СТВ-24 часа».

15.55 «Вавилонская башня». Сериал.
17.00 Вечерние новости.
17.25 «Сын полка». Спецрепортаж.
17.45 Жди меня.
18.40 Сериал «Ускоренная помощь-2».
19.15 Комедия «Когда казаки плачут».
19.45 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
21.00 Сериал «X-files».
